**Мікалай Рудкоўскі**

# Дажыць да прэм'еры

*Камедыя ў двух актах*

## ДАЖЫЦЬ ДА ПРЭМ'ЕРЫ

*Камедыя ў двух актах*

*Пераклад з рускай мовы*
*Віталя Краўчанкі*

***ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ:***

Вера
Лёша
Каця
Інструктар
Жанчына

### ПЕРШЫ АКТ

*Аднойчы партызанцы Веры прыснілася, што яна - матылёк: яна весела пырхала, была шчаслівая і не ведала, што яна партызанка. А раптоўна прачнуўшыся, нават здзівілася, што яна Вера. І не ведала ўжо: ці то ёй снілася, што яна матылёк, ці то матыльку сніцца, што ён партызанка.*

#### *Сцэна 1*

*Сакавіцкая ноч, цёплы ложак.*

**Вера**. Цішэй. Не храпі. Цішэй. Павярніся на другі бок.
**Лёша**. Ой.
**Вера**. Цсссс. Немцы пачуюць, прыйдуць.
**Лёша**. О-о-ой.
**Вера**. Не "ой", а не храпі так моцна. Усіх фашыстаў разбудзіў.
**Лёша**. Ды спяць твае фашысты.
**Вера**. Не спяць.

**Лёша**. Спяць, дрыхнуць, сапуць. Моцна. Яны стаміліся за дзень шукаць партызанаў, расстрэльваць і спяць, як забітыя.
**Вера**. Не. Яны недзе побач.
**Лёша**. Ё! Ё! Ё! Ё! Ё! Ё! Далёка яны. Стаміліся ўвесь дзень за аўчаркамі бегаць.
**Вера**. Што ты вярзеш?
**Лёша**. Ты сама ў ботах па лясах ды балотах пабегай за аўчаркамі. Ведаеш, як ногі за дзень гудуць.
**Вера**. Лёша...
**Лёша**. А расстрэльваць па дзесяць чалавек на дзень... вочы не бачаць, рукі аднімаюцца. Вось яны і спяць без задніх ног.
**Вера**. Дурніла.
**Лёша**. А раніцаю. Дзве хаты раніцаю спалілі. Колькі ж ім давялося папрацаваць: сена нацягаць, г**а**заю abліць, вуглы падпаліць. А каністры з г**а**заю не лёгкія. Ё! Ё! Ё! Цягаць іх узад-уперад. Цяжар які! А зараз сакавік, вакол гразь, слізка...
**Вера**. Пачалося!
**Лёша**. А пасля дым-гар нюхаць. Смурод! Прыбіраць, расчышчаць усё. Ё! Ё! Пратакаляваць, дакумантаваць без выходных і прэміяльных, як жа я спаць хачу...
**Вера**. Вышэйшая ступень цынізму. Перавярніся на другі бок і спі.
**Лёша**. А-я-яй! Цынізм! Фашыстам добра. Яны салодка спяць. А ты мяне разбудзіла. Якая зараз гадзіна?
**Вера**. Менш храпець трэба.
**Лёша**. Менш казак пра вайну трэба выдумляць.
**Вера**. Хопіць ужо. Спі.
**Лёша**. Ё! Ё! Ё! Тры гадзіны ночы.
**Вера**. Надакучыў.
**Лёша**. А як ты мне надакучыла.
**Вера**. Хопіць, сказала. Адбой.

**Лёша**. Лепей бы нацысты прыйшлі і цябе ў гестапа забралі. Там бы цябе навучылі добрым манерам…
**Вера**. Не бурчы. Адно вочка заплюшчвай, другое заплюшчвай… І не храпець.

### *Сцэна 2*

*Туманны дзень. Яшчэ больш туманна ў кафэ ад дыму цыгарэтаў.*

**Вера**. У цябе яшчэ ёсць цыгарэта?
**Кацявзюля**. Вядома. Бяры… Ой, у салярыі новыя лямпы ўсталявалі, ягадзіцы абгарэлі і чэшуцца.
**Вера**. Як учора з хатнімі ўсё прайшло?
**Каця**. Пакуль аніяк.
**Вера**. Каця, колькі можна марудзіць?
**Каця**. Колькі, колькі… Ну не змагла я. У цябе хоць муж малады, багаты ды вясёлы. Пасмяецца-пазлуецца, ды і даруе. А ў мяне бацькі састарэлыя, і з гумарам у іх, як у нашым тэатры з заробкамі.
**Вера**. Ай, у цябе ўвесь час адгаворкі. Два тыдні рэпеціруецца гэтая ваенная п'еса, а ты да гэтага часу анічога не прыдумала, каб хоць дома апраўдаць свой вобраз.
**Каця**. Але, не кажы… Вось, напрыклад, учора я нібыта ў танку гарэла.
**Вера**. Гэта ў салярыі?
**Каця**. Так. Цяпер у калготках так некамфортна: яшчэ больш чэшацца.
**Вера**. А як партызанка адна апынулася ў танку?
**Каця**. А-а-а… Гэта… Дык не адна! Папрасіла, каб падвезлі.
**Вера**. Каго?
**Каця**. Немцаў. Яны якраз за горад ехалі. Пару кіламетраў пракаціліся, я і падарвала іх усіх. Ледзь жывою засталася.
**Вера**. Якое глупства. Ты такая ж несур'ёзная, як і мой Лёша.

**Каця**. Але пятая кропка мая баліць сур'ёзна.
**Вера**. Не баліць, а толькі чэшацца.
**Каця**. Ага. Не толькі, а яшчэ як! Памазаць бы чым зараз…
**Вера**. Боль унутраны прыдумаць трэба, абыграць. Я штоноч мужа буджу, правяраю яго і сябе, што рабіць на выпадак, калі фашысты нас знойдуць…
**Каця**. А Лёша не заб'е цябе раней?
**Вера**. Не, прывыкае…
**Каця**. Ага, да тваіх аблаваў.
**Вера**. Так, неабходна пераходзіць да больш актыўных дзеянняў.
**Каця**. Згодная… А хочаш, я на нарах спаць буду, як у камеры-адзіночцы?
**Вера**. Хачу, але гэтага недастаткова.
**Каця**. Не ў адзіночцы?
**Вера**. Так. Трэба чужую рэакцыю вывучаць. Ты будзешь з бацькамі ў адным пакоі спаць на падлозе.
**Каця**. Чаму на падлозе?
**Вера**. Бо нары ты будзеш да прэм'еры стругаць.
**Каця**. А ў маім пакоі што будзе?
**Вера**. У ім будзе хавацца габрэйская сям'я. Ты дзверы заб'еш і шафаю заставіш. І каб аніякага святла з вакна.
**Каця**. Што ж я бацькам скажу?
**Вера**. Праўду. Нашую. Рэакцыя, магчыма, будзе абуральнаю, але ты мусіш пераканаць іх. Ты артыстка-партызанка. І назірай за іхняй рэакцыяй…
**Каця**. Ага, па Станіслаўскаму. Ой, маманькі-і-і…
**Вера**. А ты думала… Гэта табе не адным месцам чырванець. Тут талент патрэбны.
**Каця**. Як жа я з імі ў адным пакоі?
**Вера**. Нічога, пацiснуцца. У дзяцінстве ты любіла да бацькоў у ложак залазіць?
**Каця**. Дык то ж у дзяцінстве. Ноччу страшна было.
**Вера**. А на вайне не страшна?

**Каця**. Пакуль не ведаю. Хоць бы-то псіхбрыгаду на мяне не выклікалі.
**Вера**. Дарэчы. Тэлефон адрубі! Нібыта бамбёжка была. Я таксама дома тэлефон адключу. Толькі мабільныя сабе пакінем.
**Каця**. Так, у арміі сувязісткі патрэбныя… А што ў цябе сёння па плану?
**Вера**. Праверым фанаграму са спектакля ў фітнэс-клубе.
**Каця**. Не псуй людз**я**м фігуры.
**Вера**. Гэтым не сапсую. Яны яшчэ хутчэй пачнуць калорыі скідваць.
**Каця**. І навошта наш Іванавіч спектакль пра вайну ставіць? Дзе б камедыі пра любоў альбо меладрамы пра… пра…
**Вера**. …любоў.
**Каця**. Так-так. Бо гэтыя п'есы пра вайну мяне так вымотваюць. Так вымотваюць мяне… Яшчэ па соку і на фронт?
**Вера**. Давай. Паўлітра за перамогу.

## *Сцэна 3*

*Трэнажорная зала. Анікога няма, акром інструктара, які слухае раманс.*

**Вера**. Ды ў вас сёння аншляг.
**Інструктар**. Так, блін. Дзякуй, што зайшлі на аганёк. Бо я ўжо пачаў думаць, што ўсе на мяне забыліся, ніхто мяне не любіць…
**Вера**. Я не за любоўю сюды хаджу.
**Інструктар**. І так увесь час. Я з любоўю, блін, паляпшаю вашыя целы для любові, а любяць вас іншыя.
**Вера**. Не здагадаліся. Маю іншыя мэты. Ці можна паставіць гэты дыск, пакуль буду на бегавой дарожцы?
**Інструктар**. Калі ласка. Што за гурт?

**Вера**. Сабачы брэх.
**Інструктар**. Блін, рэп ці што?
**Вера**. Не. Сапраўдны брэх. Нямецкіх аўчарак.
**Інструктар**. І праўда, брэшуць, блін.
**Вера**. Ну, я пабегла...
**Інструктар**. Толькі без фанатызму. За пульсам сачыце, бо сабакі вас загоняць.
**Вера**. До-обра-а-а.
**Інструктар**. І за дыханнем таксама.
**Вера**. Адча-а-апі-іце-еся-я-я…
**Інструктар**. Я ў дзяцінстве марыў пра сабаку. Добра паводзіў сябе, прыбіраў за сабою. А бацька-прыдурак купіў мне марскую свінку, блін. Так, яна калматая, як шчаня, але ж не шчаня, блін. Я думаў, яна і праўда марская, узяў яе з сабою ў ванну, каб паплаваць разам. Яна лапкамі дрыгатала, слізгатала па кафелі і бультых. Прайшоў час. Ужо ў школе я зноў папрасіў сабаку. Нават вучыўся ўсю чвэрць на чатыры і пяць, блін. А мне купілі двух папсовых хамякоў і двух папугаяў-панкаў, з іракезамі замест чупрыны!
**Вера**. Не вы-ыжы-ылі-і-і?
**Інструктар**. Так, блін. Палеглі смерцю храбрых. Падрабязнасці расказаць?
**Вера**. Не-е-е.
**Інструктар**. На халеру мне чатыры маленькія пачвары, калі я хачу аднаго нармалёвага сабаку? Я пакрыўдзіўся на дарослых і прыдумаў, што я сам сабака. Злы кабель. Я пачаў займацца спортам, каб надалей ціснуць усіх гэтых хвалістых, калматых, нефармальных вырадкаў, блін.
**Вера**. Пту-уша-ак?
**Інструктар**. Не, розных адкідаў. Хацеў пайсці ў міліцыю, у АМАП, але не ўзял**<u>і</u>**, блін. Паступіў у інстытут фізічнай культуры.
**Вера**. Вам кры-ы-ыўдна-а-а?

**Інструктар**. Яшчэ чаго, блін! У мяне цяпер хобі. Я падпрацоўваю на даму.
**Вера**. Кі-і-ім?
**Інструктар**. Цяпер усе гэтыя мелкія і слаб**ы**я пёрыстыя грызуны з чупрынамі самі да мяне ідуць за моцнымі пачуццямі. Ды яшчэ і плоцяць мне.
**Вера**. Ой, больш не магу бегчы... Ой... Не зразумела вас, за што плоцяць?
**Інструктар**. За моцныя пачуцці, разумееш?
**Вера**. Не.
**Інструктар**. За пакуты, блін.
**Вера**. Вы... сада-маза?
**Інструктар**. Не! Як можна?! Не. Толькі сада. Цісну, б'ю, прыніжаю, катую...
**Вера**. Катуеце?
**Інструктар**. Так, катую. А што?
**Вера**. Нічога. Гэта цудоўна. Нават больш таго. Лепей не бывае.
**Інструктар**. Блін, ды ў вас вочы заблішчэлі.
**Вера**. Так-так. Магчыма. Думка адна з'явілася.
**Інструктар**. Калі што, заўсёды да вашых паслугаў.
**Вера**. А як у вас з фантазіяй? Добра працуе?
**Інструктар**. А то, блін. А што?
**Вера**. Фашыстам ужо былі?
**Інструктар**. Не... Але... з радасцю.
**Вера**. Выдатна. А што, калі я з сяброўкаю прыйду?
**Інструктар**. Блін. Ну... добра. Чым больш, тым лепш.
**Вера**. Нумар тэлефону свайго запішыце.
**Інструктар**. Ай момант.
**Вера**. А чаму вы зараз сабаку не завядзеце?
**Інструктар**. А каб ні на што не забыцца. Вось нумар. Прыходзьце, не пашкадуеце. Мы з вамі... Мы з вамі... пырснем жарсцю, як маянэзам... праміж бутэрброду.
**Вера**. Нічога сабе, блін.

## *Сцэна 4*

*Цёмны пакой. Нават занадта цёмны.*

**Вера**. Прыйшоў ужо? Пераапранайся і дапамажы мне.

**Лёша**. Чаму так змрочна? Табе далі ролю вампіркі?

**Вера**. Не, я раблю прыцемкі на выпадак авіяналёту.

**Лёша**. Ага, у небе начныя вядзьмаркі.

**Вера**. Ты правільна разважаеш.

**Лёша**. І за цябе, між іншым, я хвалююся.

**Вера**. Дарэмна.

**Лёша**. Мне здаецца, ты найграеш.

**Вера**. Я яшчэ нават і не пачынала граць. А яшчэ ў ЖЭСе сказалі, што ваду і электрычнасць будуць перыядычна адключаць з 9-й вечара да 8-й раніцы.

**Лёша**. Ты гэта добра прыдумала: не мыцца ў цемры.

**Вера**. І з тэлефоннай лініяй нешта не ўсё ў парадку.

**Лёша**. Яшчэ лепш. А на вячэру што?

**Вера**. Бульба ў мундзірах.

**Лёша**. Што?

**Вера**. Што чуў. У цяперашні час гэта раскоша.

**Лёша**. Ведаеш, Вера, я і так цярплю твае партызанскія выбрыкі, але калі ты яшчэ і карміць мяне не будзеш...

**Вера**. Карміць не буду? А чым табе бульба не дагадзіла? У мундзірах!

**Лёша**. Няўжо я так мала зарабляю, каб пальцы аб твае мундзіры пэцкаць?

**Вера**. Не гняві Бога!

**Лёша**. Ды што ж гэта такое? Ты пастар ці партызанка?

**Вера**. Партызанка, веруючая партызанка.

**Лёша**. Веруючая Вера…

**Вера**. Вера, якая верыць, што калі людзі выжылі тады, дык і зараз могуць печаную бульбу есці са смакам. Толькі я ніяк пакуль не магу зразумець, як яны выжылі? Вось у чым справа.

**Лёша**. Я таксама не разумею. Можа, супакоімся і сходзім у кафэ-кафэ?
**Вера**. Ні ў якім разе. Я лепей блакадны Ленінград тут учыню, чым здраджу сваім ідэям.
**Лёша**. Глупства гэта ўсё! Ты не такая вялікая драматычная актрыса, і табе не плоцяць такія ганарары, каб ты так усё гэта пражывала, рабіла эксперыменты на сабе, на мне…
**Вера**. Так. Я не вялікая. Але мне неабходна гэта зразумець ужо нават не як актрысе. Мне гэта цікава як чалавеку, сучаснаму чалавеку, жанчыне, грамадзянцы, на чыёй радзіме была вайна. Зразумей мяне.
**Лёша**. Я жэрці хачу! У свеце крызіс, я кручуся, як нямецкая аўчарка на працы, прыбыткі падаюць, не магу паехаць у адпачынак, таму што паўсюль свінячы грып. Вось што цікава сучаснаму чалавеку: як выжыць зараз?! Зараз! Зараз! І пажраць!
**Вера**. Вось! Вось! Давай будзем разам выжываць. Разам. Выжываць.
**Лёша**. Ё! Ё! Ё! Ё! Ё! Ё! Ё!
**Вера**. Хочаш, я табе бульбу ад мундзіроў аблуплю.
**Лёша**. Я сам. Успомню дзяцінства. Цяжк**<u>о</u>**е дзяцінства.
**Вера**. Пацярпі крых**<u>у</u>**. Праз месяц прэм'ера.
**Лёша**. Праз месяц? Ё! Ё! Ё! Час адкрываць другі фронт.

### *Сцэна 5*

*Шыльда "Золата. Ламбард. Рамонт гадзіннікаў" і гэтак далей. Жанчына з сумкамі, пакетамі, тэлефонамі…*
**Жанчына**. Золата? Срэбра? Медал**<u>і</u>**?
**Вера**. Што-што?
**Жанчына**. Што здаваць валачэш?
**Вера**. Я?
**Жанчына**. Не! Пушкіна жана! З чым прыйшла?
**Вера**. Запінкі мужа.

**Жанчына**. Залатыя?
**Вера**. Плацінавыя.
**Жанчына**. Дажыліся. Паказвай, што за цацкі такія.
**Вера**. Вось. Ад Армані.
**Жанчына**. Нябожчыка. А нічога сабе. Прыгожа.
**Вера**. Падабаюцца?
**Жанчына**. Падабаюцца не падабаюцца, а хочаш жыць, умей вярцецца. Колькі хочаш, красавіца?
**Вера**. Пяць буханак хлеба.
**Жанчына**. Ты чаго?!.
**Вера**. Чатыры. Не меней..
**Жанчына**. Буханак хлеба?
**Вера**. Так.
**Жанчына**. Дзе я табе іх вазьму? Чатыры буханкі!
**Вера**. Жанчынка, богам прашу! Добрыя ж запінкі. Я толькі чатыры буханкі хлеба прашу…
**Жанчына**. Якога хлеба? Якога такога, на фіг, хлеба?!
**Вера**. Усё роўна якога. Памяняйце, прашу вас. Гэта ж Армані…
**Жанчына**. Ды няма ў мяне хлеба! Грашыма бяры.
**Вера**. Няма хлеба? Як няма хлеба? Нам есці няма чаго.
**Жанчына**. Ды што ж гэта за дзень такі сёння?!
**Вера**. Богам прашу, жанчынка, калі ласка. Я вам рукі цалаваць буду. Муж галадае. Ён ужо вельмі слаб**ы**.
**Жанчына**. Не трэба мне рукі цалаваць! Грошы будзеш браць?
**Вера**. Не буду. Мне не патрэбны грошы. Хаця б тры буханкі…
**Жанчына**. Маць мая жэншчына!
**Вера**. Я хлеба хачу!
**Жанчына**. Ня-ма! Няма ў мяне хлеба!!!
**Вера**. Добра. Па буханцы за запінку.
**Жанчына**. Дзве за запінкі?
**Вера**. Так, альбо я да іншых пайду.

**Жанчына**. Стаяць! Так. Так. Чакай! Так! Што робім? Што робім? Што мы зараз зробім?.. Людзі добрыя… Што ж гэта робіцца ў свеце?! Спакойна, спакойна, спакойна. Гэта я сама з сабою. З сабою. Зараз што-небудзь прыдумаем. Табе хлеб патрэбен?
**Вера**. Так, вельмі!
**Жанчына**. Я зараз прынясу.
**Вера**. Дзякуй, дзякуй вам!!!
**Жанчына**. Праз дзесяць-пятнаццаць хвілінаў.
**Вера**. Дзякуй, збавіцельніца мая!
**Жанчына**. Ды цішэй ты! Толькі нікуды не сыходзь і запінкі нікому не паказвай. Дамовіліся?
**Вера**. Толькі хутчэй.
**Жанчына**. Добра!!! Схавай! Спакойна, спакойна. Схавай запінкі, каму сказала! О-о-о-о-о, матка Боска!
**Вера**. Гатова.
**Жанчына**. Та-а-ак! Та-а-ак! Калі хто запытаецца, што тут робіш…
**Вера**. Нічога.
**Жанчына**. Я табе дам нічога! Скажаш: сястру чакаю, у кіно сабраліся.
**Вера**. Так. Зразумела.
**Жанчына**. Калі раптам хто запытаецца, чаму тут чакаеш…
**Вера**. Таму што…
**Жанчына**. Таму што тут людзей мала, а месца шмат.
**Вера**. Зручна сустракацца.
**Жанчына**. Так. Зразумела?
**Вера**. Зразумела. Хлеб нясіце.
**Жанчына**. Белы? Чорны?
**Вера**. Усё роўна.
**Жанчына**. Выходзіць, белы.
**Вера**. Лепей чорны.
**Жанчына**. Добра. Будзе адзін белы, другі чорны.

**Вера**. Можна сітны?
**Жанчына**. Ой, каб я яшчэ разумела што-небудзь у гэтым... Я хлеб не ем. У мяне дыета.
**Вера**. Тады жытні. Ды хоць які! Усё роўна! Абы хлеб быў. Смачны, мяккі, свежы хлеб. Быў. Хлеб...

### Сцэна 6

*Жаночая грымёрка. Па трансляцыі перыядычна гучыць фанаграма са спектакля пра вайну. Артысткі-партызанкі занятыя важнаю справаю.*
**Кацця**. А мы не ўзляцім?
**Вера**. Не дрэйфі! Бутэльку мацней трымай. Ты ўжо пераехала ў пакой да бацькоў?
**Кацця**. Так! Да нас сваякі з Польшчы прыехалі...
**Вера**. Гэта не тое.
**Кацця**. Лічы, што гэта бежанцы, польскія габрэі хаваюцца.
**Вера**. Гэта ўсё паддаўкі.
**Кацця**. Але тэлефонны дрот адсекла. Незаўважна так. Храк ножыкам па дроціку...
**Вера**. Бутэльку трымай!!!
**Кацця**. Вера, Вера, а гэта не небяспечна?
**Вера**. Пакуль не. Ды і якая тут можа быць небяспека? Звычайны бензін і машыннае масла.
**Кацця**. А ў рэцэпце ты ўпэўненая?
**Вера**. Як у Інтэрнэце вычытала, так і раблю.
**Кацця**. Ой, не падабаецца мне гэты кактэйль Молатава. Не падабаецца...
*Па трансляцыі чуваць выбухі.*
**Вера**. О, нашыя ў атаку пайшлі. Сёння наш рэжысёр у эйфарыі.
**Кацця**. “Наш Іванавіч штаны забыўся зняць нанач”.
**Вера**. Галоўнае, каб не забыўся, што праз чатыры тыдні прэм'ера, а мы ўжо тры гадзіны пачатак спектакля

рэпеціруем. Армія ўжо па дзясятаму разу ў атаку пайшла, а мы, партызанкі, як дурніцы ў грымёрках сядзімо.
**Каця**. Затое выбухоўку паспелі зрабіць.
**Вера**. Так. Усё, закрываем. Закаркоўваем.
**Каця**. І што?
**Вера**. І ўсё цудоўна. Запальнічкай "чырк" і бабах!
*Па трансляцыі гучаць крыкі "Ура!".*
**Каця**. Каго?
**Вера**. Знойдзем каго. Хутка ў нас будзе важнае партыйнае заданне.
**Каця**. А ці атрымаецца ў нас?
**Вера**. Атрымаецца.
**Каця**. Жа-а-ах...
**Вера**. Гэта ты жахлівая партызанка, Каця. Ідзі сёння да нашага геніяльнага Іванавіча, сядзь элегантна на канапку для размеркавання роляў і папрасі ў яго новую ролю.
**Каця**. Якую?
**Вера**. Эсэсаўкі.
*Па трансляцыі чуваць нямецкі марш.*
**Каця**. Ты ўпала?
**Вера**. Не! З цябе класная эсэсаўка выйдзе. Загарэлая такая ўся. З балтыйскага пляжу ў штаб прыехала.
**Каця**. Супакойся.
**Вера**. Данцыгскі манікюр, патсдамскі педыкюр...
**Каця**. Не хачу эсэсаўку!
**Вера**. Ты зірні на сябе! Іванавіч старэнькі, з залы не бачыць твае нарошчаныя пазногці.
**Каця**. Я перад прэм'ерай лак здыму.
**Вера**. А да прэм'еры? Дзе ты бачыла партызанку з бэзавым лакам? Адкуль такі колер?
**Каця**. Гэта зараз у модзе.
**Вера**. Эсэсаўка!
**Каця**. Можа бардо паспрабаваць?
**Вера**. Куды тут бардо? Я разумею яшчэ ярка-чырвоны...

**Каця**. Ёсць?
**Вера**. Так. Не! Што ты?! Я ў Чырвоны крыж усё аддал**а**. Усё. Эсэсаўка!
**Каця**. Сама такое слова.
**Вера**. Зірні на мае пазногці. Во! Нармалёвыя падпольныя пазногці. Што скажаш? А?! Не тое, што твае!
**Каця**. Дык што мне? Чатыры тыдні без манікюру хадзіць?
**Вера**. Так!
**Каця**. Якая ты жорсткая.
**Вера**. Не, калі ласка, можаш папрасіць у такім разе ролю якой-небудзь калабарацыяністкі.
**Каця**. Яшчэ чаго!
**Вера**. За бутэлечку бэзавага лаку будзеш абслугоўваць нямецкіх афіцэраў…
**Каця**. Не-е-е…
**Вера**. ... радзіму прадаваць…
**Каця**. Не, не і яшчэ раз не!
**Вера**. Альбо партызанку-здрадніцу. Класічную такую. Ваявала, ваявала, а пасля труханула, спужалася…
**Каця**. Не! Я люблю ролі на пераадоленне! Я мушу гэта сыграць. Мушу. Я пайду да канца. На любыя ахвяры дзеля мастацтва.
*Па трансляцыі чуваць выбухі.*
**Вера**. Малайцом! Прысягай! Паўтарай за мною: Я, Каця..
**Каця**. Я, Каця…
**Вера**. Уваходзячы ў шэраг артыстак, якія граюць партызанак…
**Каця**. Уваходзячы ў шэраг артыстак, якія граюць партызанак…
**Вера**. Урачыста прысягаю, што я да прэм'еры…
**Каця**. Урачыста прысягаю, што я да прэм'еры…
**Вера**. Не буду наведваць салярый…
**Каця**. Не буду наведваць салярый…
**Вера**. Фітнэс-клуб…

**Каця**. Фітнэс-клуб..
**Вера**. Кафэ, рэстараны, начныя клубы…
**Каця**. Ой, як гэтая вайна недарэчы, кафэ, рэстараны, начныя клубы…
**Вера**. Цырульню…
**Каця**. Цырульню?
**Вера**. Так, цырульню!
**Каця**. І цырульню…
**Вера**. Салон прыгажосці.
**Каця**. О-о-о-о, салон прыгажосці!
**Вера**. Калі я парушу абяцанне, няхай мае таварышы пагарджаюць мною…
**Каця**. Калі я парушу абяцанне, няхай мае таварышы пагарджаюць мною…
**Вера**. І ніколі больш не будуць са мною кантактаваць, таму што я буду…
**Каця**. І ніколі больш не будуць са мною кантактаваць, таму што я буду…
**Вера**. Самай апошняю свіннёй.
**Каця**. Самай апошняю… А галаву мыць можна?
**Вера**. Гаспадарчым мылам.
**Каця**. Фашысты! Свалата! Ненавіджу!!!
*Рыданні Каці заглушае фанаграма налёту нямецкай авіяцыі.*

### *Сцэна 7*

*Сакавіцкі вечар. Кухонны стол.*
**Лёша**. Вячэру яшчэ доўга чакаць?
**Вера**. Зараз.
**Лёша**. Ё! Ё! Ё! Зыходныя адключылі. Калі я паспеў столькі нагаварыць? Г**а**ды! Пятнаццаць тэлефанаванняў зрабіў, а ўжо адключылі. Што за здзек такі? Толькі раніцаю кінуў капейчыну, як аператары хуценька ўсё зжэрлі… Калі вячэраць будзем?

**Вера**. Зараз.

**Лёша**. Не. Няўжо я столькі гавару? Казлы. Як гэта заўтра паспець заплаціць? Так няўчасна ўсё гэта. Давядзецца раней уставаць. Праз нейкіх сотавых аператараў прачынацца на паўгадзіны раней, каб паспець усё зрабіць. Вар'яцею. Дзе гэтая функцыя "Будзільнік"? Так. Які заўтра дзень? 1-е красавіка. Добра заўтра дзень дурня пройдзе: адным дурням заплаціць, двум дурням патэлефанаваць, з чатырма сустрэцца і трох дурняў дырэктар загадаў звольніць. Ён мне сказаць - сказаў, а вырашаць мушу я. Разумнік. Ё! Ё! Ё! Вячэра гатовая?

**Вера**. Зараз, зараз.

**Лёша**. Што за жыццё? Не жыццё, а нейкае скарачэнне штату. А зуб на мяне будуць мець, а не на дырэктара. А яшчэ ўсім заробкі скароцяць на дзесяць адсоткаў. Уяўляю, што тады пачнецца. Паехаць бы ў адпачынак ад гэтага крызісу. Ага. З'едзеш тут. Як з'едзеш, дык_ужо і не вернешся. Альбо звольняць, альбо што-небудзь скароцяць табе. Можа, хаця б на выходныя рванем_куды? А-а-а-а, увесь час забываюся. У цябе ж прэм'ера хутка. Будзем працаваць. Працаваць! Працаваць! Атрымоўваць меней, скарачацца і так да пенсыі. Калі ўжо вячэраць?

**Вера**. Зараз, зараз.

**Лёша**. А што новае з'явілася ў свеце? Самалійскія піраты захапілі танкер з нафтаю. Цудоўна! Малайцы, хлопцы! Так і трэба. Тут бензін даражэе, а яны цалюткі танкер – хап! Сярод белага дня, сярод акіяну. Маглі б ужо і мне пару бараляў падарыць. Ё! Ё! Ё! І сапраўды, чаму людзі не лётаюць, як птушкі? Зараз увечары злётаў бы ў Ірак альбо ў Венесуэлу са сваёю каністраю па танны бензін. Але ж навошта мне ў такім выпадку бензін? Заляцець бы на які каралявы атол, маракую сарваць і з'есці, у пясочак залаты ды цёплы зарыцца. Ці лепей у Мілан, па новы касцюм, гальштукі і кашулі? І табе шмоток новых прывёз бы.

Споднзяе, сукенку ад Кавалі, сумку Тодс… Толькі на зваротным шляху рукамі размахваць нязручна будзе. З новымі фірмовымі шмоткамі тваімі… Дык што там з вячэраю?
**Вера**. Зараз, зараз.
**Лёша**. Альбо ў Парыж па віно добра было б… Ляціш, віно папіваеш, пармезанам прыкусваеш, цыгару пацягваеш. Толькі еўры патрэбны. Ды што я грошы ўсё лічу? Вось. У Эфіопіі зноў зас**у**ха. Галадуюць. Ці хутка ты ўжо?
**Вера**. Зараз, зараз.
**Лёша**. Але ж, вельмі добра, што людзі не лётаюць, як птушкі, бо гэтая чарната тутэйшая афрыканская, як саранча, наляцела б і на нас, і на Еўропу, і ў Манака. Такая срака. Ой, прабач. Ты ж не любіш, калі я брыдкаслоўю. Карацей, вакол пятая кропка. Велічэзная такая, спелая пятая кропка. Выходзіш з пад’езду, і вось яна, ружовая пятая кропка, свеціць табе, як сонейка. А можа сонца і ёсць сра… сра… гэта… пятая кропка? Гарачая такая, пякельная ўся. І мы вакол яе круцімся, круцімся. І ў пятай кропкі зерне такое вялікае, падсмажанае… Ды ці будзе вячэра калі-небудзь?
**Вера**. Вось.
**Лёша**. Не зразумеў.
**Вера**. Што не зразумеў?
**Лёша**. Кёс ке сэ, мадам? Шо цэ? Што гэта?
**Вера**. Хлеб. Табе дарослая працоўная порцыя. Сто дваццаць грамаў. Мне дастаткова семдзесят пяць. Смачна есці.
*Доўгая паўза. Вера паглынае хлеб. Лёша назірае. Пасля таксама пачынае есці хлеб. Павольна з’ядаюць усё да апошняй крошкі.*
**Лёша**. Дзякуй. Было вельмі смачна.
**Вера**. Ты злуешся на мяне?

**Лёша**. Не. “Злавацца” ад слова “зло”. А я кахаю цябе. Таму пакутую. Таму цярплю. І чакаю, чакаю, чакаю, калі ўжо адбудзецца твая прэм’ера.

### *Сцэна 8*

*Паліцы супермаркету, заваленыя прадуктамі харчавання. Дзве артысткі-партызанкі, заваленыя новымі ідэямі.*

**Вера**. Гэта не тое… Не тое… Нічога не падыходзіць.

**Каця**. Якая розніца? Галоўнае – пранесці хоць што-небудзь.

**Вера**. Нам патрэбна нешта вялікае і цяжкое, падобнае на міну.

**Каця**. Я думала, уся справа ў прынцыпе, а не ў габарытах. Мы ў школе маленькія шакаладкі кралі, а неяк перабліталі са страху і прэзерватывы на касе скамуніздзілі.

**Вера**. Бабуля расказвала, што яна праносіла ў горад круглую міну. Прычым прывязвала яе да спіны майго таты. Ён грудным тады яшчэ быў. Спавівала яго і так праносіла. Праўда, тата хварэў часта і да трох год хадзіць не мог.

**Каця**. І не шкада ёй было таты?

**Вера**. Чаго не ведаю, таго не ведаю. Зараз, вядома, падрабязна б у яе ўсё выпытала. Гэтая бляшанка таксама нам не падыходзіць.

**Каця**. Трэба было ўважліва жывую бабулю ў дзяцінстве слухаць.

**Вера**. Хто ж ведаў, хто ж ведаў.

**Каця**. І маіх ужо няма. Але яны ў Заходняй Беларусі жылі, і немцы ім нібыта дапамагалі нават. Я не вельмі добра памятаю гэтыя расповяды. На Новы год парася ім падарылі. А можа, у ветэранаў інтэрв’ю возьмем?

**Вера**. Было б дарэчы. Вось нічога такі карабок, не лёгкі. Трэба ўважыць тваю прапанову.
**Каця**. Ветэранаў яшчэ шмат засталося. Нават уявіць цяжка, адкуль у іх столькі сілоў пасля вайны? Мы дакладна не дажывем да іхніх гадоў. Хаця б да пенсіі дацягнуць. Бо гэтыя кампары, марціні – такая нагрузка на арганізм. А давай па бутэлечцы марціні пранясем? Накшталт нашага кактэйлю Молатава. А?
**Вера**. Каця. Алкаголь!
**Каця**. Фу! Фу! Якая дрэнная дзяўчынка! Што гэта я гавару?! Алкагаліца! Фу! О-о-о, шампанскае брют! Можа яго? За Радзіму? За Сталіна? Ой, ізноў я… Фу! Фу! Каця! Ты дрэнная! Дрэнная, дрэнная, дрэнная! Марціні з водачкай, крыху лёду і аліўку… П'янь! П'янь! Дрэнная дзяўчынка! Сорам! Ганьба! Сорам!
**Вера**. Зразумела. Адыдзем у іншы аддзел.
**Каця**. Кіяховыя камячкі! Ой! Сто гадоў не ела.
**Вера**. Дарэчы, дарэчы. Можам іх прыхапіць у нагрузку. Быццам пачак улётак з падпольнай друкарні.
**Каця**. Ой, не. У мяне быў хлопец, у яго шкарпэткі чамусьці кіяховымі камячкамі смуродзілі. Так дзіўна. Як здыме абуўку, дык адразу мне здаецца, што я ў цырку, дзе папкорн прадаюць, салодкую вату, і там пах жывёлаў розных…
**Вера**. Цырк – гэта нядрэнна…
**Каця**. А мяне ванітавала.
**Вера**. А заапарк, дарэчы, яшчэ лепш. Ёсць ідэя.
**Каця**. У цябе ўвесь час столькі ідэяў. А я тады ляжала на сп**і**не, як вожык у тумане, ён на мне, а я думала: “Чаму ж менавіта кукурузнымі камячкамі?” Адкуль гэта? Навошта гэта? Куды гэта? Для каго гэта? Дзе гэта?
**Вера**. Так, заапарк. Менавіта заапарк.
**Каця**. А мяне ўчора так пакрыўдзілі, так пакрыўдзілі.
**Вера**. У заапарку?

**Кацця**. Амаль што. Запрасіў мужчына ў госці. Пілі каньяк, балбаталі, прыціскаліся… Сама сабе думаю, зараз пачнецца. А ён вырашыў мне фоткі з Тайланду паказаць. Думаю, нічога, пагляджу дзеля прыстойнасці і с**е**кс. А ён на першым жа фатаздымку нейкую пачвару мне падсоўвае і пытаецца: “Што гэта за птушка?” Скуль мне ведаць, што за птушка? Я што? Павінна была ў тэатральным заалогію вывучаць? А ён кажа, што гэта тукан.
**Вера**. Тукан?
**Кацця**. Тукан! І дадае: “Мяне вабяць толькі адукаваныя і разнастайныя. Бывайце!” Такі ўжо тукан. А што было б, калі б я ўва ўсіх сваіх каханкаў пыталася, у якім годзе МХАТ адкрыўся, хто такая Аліса К**о**анэн, як называўся апошні спектакль Меерхольда? Я б да гэтага часу некранутаю была. Праз такіх туканаў. Што гэта? Куды гэта? Для каго гэта? Да чаго гэта? Як гэта? З кім гэта?
**Вера**. Я, Кацця, раю табе да прэм’еры пра сэкс не думаць.
**Кацця**. Здароў табе! У гэтым я не прысягала.
**Вера**. А давядзецца.
**Кацця**. Ні за што! Краіне патрэбны салдаты і працаўніцы тылу. Таму ў дэмаграфічным выбуху ты мне не адмаўляй.
**Вера**. Ты як мой Лёша.
**Кацця**. І вельмі добра, сяброўка.
**Вера**. Вось! Бляшанкі з селядцом. Тое, што трэба.
**Кацця**. Якая гадасць…
**Вера**. Запіхнем пад спадніцы па бляшанцы.
**Кацця**. Холадна.
**Вера**. Майму тату таксама было холадна.
**Кацця**. Але ж у нас там…
**Вера**. Пра Радзіму думай.
*Пад выглядам, што вывучаюць цэннікі, артысткі хаваюць пад спадніцы бляшанкі. З-за спінаў з’яўляецца*

*прадавачка, знешне вельмі падобная да жанчыны, якая скупляла ювелірныя вырабы.*
**Жанчына**. Я ўсё бачыла.
**Каця**. Што здарылася?
**Жанчына**. Злодзейкі.
**Каця**. Мы? Жанчына, пабойцеся Бога.
**Жанчына**. Вы зараз мяне і міліцыю баяцца будзеце.
**Каця**. Слухай, ты, гестапаўка з паліцаямі, я такіх, як ты, да сцяны ставіла.
**Жанчына**. Што-о-о?
**Каця**. Што чула! Праз такіх, як ты, у краіне крызіс. Ніякай грамадзянскай пазіцыі, ніякай адказнасці. Толькі “дайце, дайце, дайце”. А што вы зрабілі для гэтага “дайце”? Што? Што вы зрабілі?
**Жанчына**. А што я?
**Каця**. Нічога! Ні-чо-га! Ой, як шмат грахоў мы носім на плячах!
**Жанчына**. Якія нашыя грахі?
**Каця**. О, нашыя грахі! Мы ўвесь час раскідваліся грашыма, як звар’яцелыя… нашыя мужыкі паміралі ад шампанскага… яны страшна пілі… А мы? Мы заплюшчвалі на гэта вочы, беглі, беглі ад саміх сябе, сябе не памятаючы, а яны за намі… бязлітасна, груба… Так бязглузда, так сорамна…
**Жанчына**. Што з вамі?
**Каця**. Госпадзі, госпадзі, злітуйся, *(скрозь слёзы)* даруй мне грахі мае! Не карай мяне больш… Дарагая, вельмі шаноўная паліца! Вітаю прысутнасць тваіх… тавараў, якія… былі накіраваны да светлых ідэалаў дабра і справядлівасці. (*Выцірае слёзы).* Твой маўклівы покліч да плённай працы не слабеў, падтрымліваючы ў пакаленнях нашай дзяржавы бадзёрасць, веру ў лепшую будучыню і выхоўваючы ў нас ідэалы дабра і грамадзянскай

самасвядомасці… Сястра мая, пакутніца-сястра мая! Выйдзі на… чый стогн… Нібыта музыка недзе…
*Каця, рыдаючы, садзіцца каля паліцы.*
**Жанчына**. Даруйце мне!
**Вера**. “Гэта наш незабыўны габрэйскі аркестр. Памятаеш…”
**Жанчына**. Прабачце?
**Вера**. …”чатыры скрыпкі, флейта ды кантрабас”… Пакінь нас, калі ласка.
**Жанчына**. Так, так. Вось толькі… твар ваш мне знаёмы.
**Вера**. Вы мяне нядаўна выратавалі.
**Жанчына**. Дык гэта былі вы. Можа, яшчэ хлеба?
**Вера**. Дзякуй, не трэба.
**Жанчына**. Чаго-небудзь яшчэ?
**Вера**. Вось вам за клопат. Нічога не трэба.
*Вера машынальна здымае завушніцы і аддае жанчыне.*
**Вера**. Ідзіце.
**Жанчына**. Іду. Я тут працую. Мяне вы можаце знайсці.
**Вера**. Ах, пакіньце нас!
**Жанчына**. Заробкі знізілі, дык мне даводзіцца… Самі разумееце.
**Вера**. Хутчэй ідзіце. Зараз сюды прыйдуць.
**Жанчына**. Я разумею. Усяго найлепшага. Да новых сустрэчаў.
*Жанчына адыходзіць. Каця пачынае істэрыкаваць ад смеху. Вера сядае побач з Кацяй.*
**Каця**. Як я сыграла?
**Вера**. Чараўніца проста! Толькі Антон Паўлавіч за такую кампіляцыю рукі табе паадрываў бы.
**Каця**. А што мне заставалася рабіць? Што сказаць – не ведаю, вось і пачала маналогі з Чэхава шпарыць! Калі б толькі аўтар бачыў, ён п’есу перапісаў бы.
**Вера**. Вядома.
**Каця**. Без сумневу! Такі талент, такія эмоцыі, такі плач.

*Вера, а за ёю і Каця, пачынаюць вымаць з-пад спадніц бляшанкі з селядцом.*
**Вера**. Калі мы з Лёшам упершыню займаліся каханнем, у яго раптам паліліся слёзы. Я радасна падумала: гэта ён ад шчасця, што зрабіўся мужчынам. А выйшла, што ў яго алергія на цвіценне, і ён забыўся выпіць таблетку.
**Каця**. Няшчаснік.
**Вера**. А я да гэтага часу памятаю, як ён плакаў. Як прыгожа гэта было: аргазм і слёзы!
**Каця**. А ты ведаеш, Вера, я па-сапраўднаму так і не спужалася. Мы сыгралі, а хацелася нечага іншага.
**Вера**. Так. Нам патрэбен сапраўдны страх. Ператрусу, голаду, холаду, смерці. Як пад час акупацыі ім было? Гэта ж ненармальна. Ненармальна!
**Каця**. Калі б то былі мужыкі ў форме, дык, магчыма, мы б і спужаліся. Так?
**Вера**. Мы знойдзем такіх. Я маю такі экзэмпляр. Нашая новая мэта – паспяхова прайсці катаванні. Мы мусім вытрымаць, і мы нічога не павінны расказаць ворагу, як бы мы ні пакутавалі.
**Каця**. Маманькі-і-і-і-і.

### *Сцэна 9*

*Халодны вечар, вільготны ложак.*
**Лёша**. Ё! Ё! Ё! Што адбываецца? Ты ўся дрыжыш. Чаму так мокра?
**Вера**. Так трэба. Усё добра.
**Лёша**. Што ты на гэты раз выдумала?
**Вера**. Нічога. Дробязі.
**Лёша**. У цябе дробязяў не бывае. Адказвай.
**Вера**. Не скажу.
**Лёша**. Баец Вера, я загадваю.
**Вера**. Я абліла сябе халоднай вадою.
**Лёша**. Так…

**Вера**. І выйшла на балкон.
**Лёша**. Навошта?
**Вера**. Каб зведаць, што адчувала Зоя Касмадзям'янская, калі замярзала...
**Лёша**. А, Божа.
**Вера**. Я думала, вясною цярпіма... я доўга не змагла, не змагла...
**Лёша**. І не трэба.
**Вера**. Я слаб**<u>а</u>**я.
**Лёша**. Не, ты моцная, ты вельмі моцная. Толькі вар'яцееш ад сваіх амбіцыяў. Зараз я разатру цябе.
**Вера**. Гэта так жахліва.
**Лёша**. Жахліва, жахліва, ты халодная, як жабка. Паспрабавала і хопіць.
**Вера**. Я не люблю холад.
**Лёша**. Гэта добра. Холад любіць не трэба, мяне любіць трэба, я хачу цябе.
**Вера**. Ты ўвесь час толькі і хочаш, альбо паесці, альбо мяне.
**Лёша**. Яшчэ я хачу прыгожа жыць.
**Вера**. Прыгожа жыць. А далей што?
**Лёша**. Далей? Модна апранацца.
**Вера**. А далей?
**Лёша**. Прыстойна адпачываць.
**Вера**. А далей?
**Лёша**. А далей... Ё! Ё! А далей, хочаш, мы сустрэнем гэтую ноч у Берліне? Каля Брандэнбургскай брамы будзем есці гамбургеры і запіваць іх светлым півам. А пасля ў Гаа танчыць да ўпаду на транс-вечарыне. А світанак сустрэнем у Аўстраліі, ухутаўшыся руд**<u>ы</u>**м кенгуру, а пад галовамі ў нас будуць мяккія каалы – падушкі. А снедаць будзем сярод афрыканскіх пігмеяў. Мы будзем шакаваць іх сваімі размалёванымі голымі целамі, таму што нам будзе вельмі горача ў абдымках адзін аднаго...

**Вера**. Нават не думай.
**Лёша**. Ё! Ё! Ё! Няўжо крызіс і да майго ложку дабраўся?
**Вера**. Кожнаму сваё: у цябе сусветны эканамічны крызіс, а ў мяне другая сусветная вайна.
**Лёша**. У цябе не вайна, у цябе комплексы партызанкі. Прычым дзіўныя і дзікія. Зразумей, твая бабуля-падпольшчыца нарадзіла ў сорак трэцім годзе. Выходзіць, па начох яна думала не толькі аб перамозе…
**Вера**. Як ты можаш казаць такое?!
**Лёша**. А што? Горкая праўда аб тым, як людзі і тады хацелі жыць салодка, марылі хадзіць у кіно і есці шакаладкі, цалавацца ў цемры залы і, уяві сабе, радаваліся красавіцкаму сонцу. Таму што сонца – гэта сонца. Яно не можа не радаваць. Ці табе цяжка ўявіць гэта?
**Вера**. Пакуль цяжка. Я яшчэ не спужалася так моцна, каб радавацца звычайнаму сонцу.
**Лёша**. Ё! Ё! Ё! Ані сонца табе, ані ежы, ані сэксу.
*Нечакана раздаецца званок у дзверы.*
**Вера**. Гэта за мной прыйшлі.
**Лёша**. Та-а-ак!
*Вера адчыняе дзверы. Уваходзіць Каця.*
**Вера**. Праследаванняў не было?
**Каця**. Быццам не.
**Вера**. Лёша, гэта Каця. Каця, гэта Лёша.
**Каця**. Вера, мы ж знаёмыя ўсе.
**Вера**. Зараз іншыя часы. Вакол ворагі. Каця будзе жыць у нас. Ейную сям'ю арыштавалі, яна хаваецца.
**Лёша**. Гутэн таг, Катьюшша.
**Вера**. Лёша, супакойся.
**Лёша**. Ё! Яволь.
**Вера**. Калі ласка, пакінь гэтыя выбрыкі для іншых.

**Лёша**. Зэр гуд, зэр гуд. Чым будзем госця забаўляць? Можа, камендацкую гадзіну паспрабуем? Альбо вобшук ёй учынім?
**Вера**. Мне зараз не да забаваў.
**Лёша**. Чаму гэта? А што, калі мы створым выязную брыгаду? Паказвалі б канцэрты на фронце.
**Вера**. Нарэшце годная думка.
**Лёша**. Адразу пасля вячэры! Так, дзяўчонкі?
**Каця**. Дамовіліся.
**Лёша**. Што прапанаваць вам у якасці аперытыву, фройляйн?
**Вера**. У нас усё ёсць.
**Лёша**. Сталінскія сто грамаў водкі?
**Вера**. Так.
**Лёша**. А закусваць чым будзем?
**Каця**. Я раніцаю на лузе крапівы нашчыкала.
**Лёша**. Крапівы?
**Каця**. Так.
**Вера**. Дадамо крыху бульбачкі і зварым лёгкі веснавы суп.
**Лёша**. Гэта ўсё вельмі файна. Толькі я траву есці не буду. Можа патэлефанаваць у службу дастаўкі? Як наконт піцы?
**Вера**. Піца?
**Каця** *(Веры)*. Італьянка.
**Вера** *(Каці)*. Фашыстка?
**Каця** *(Веры)*. Так! Сяброўка Мусаліні.
**Вера**. Пакараць смерцю яе!
**Каця**. Пакараць.
**Лёша**. О-о-о-о-о, пачалося. А салата?
**Каця** *(Веры)*. Салата?
**Вера**. Бяздарная!
**Лёша**. Карпача?
**Вера**. Антысэкс!
**Лёша**. Ням-ням: пулярка?

**Вера**. Пулярка – сучка! Ненавіджу.
**Лёша**. Індычка?
**Вера**. Курва, дрэнь…
**Каця**. Поскудзь!
**Лёша**. Ялавічына?
**Вера**. Дзяшовая падробка.
**Лёша**. А што, калі…
**Вера**. Пармская вяндліна твая – дзярмо сабачае!
**Лёша**. Ё!
**Каця**. Крыветкі – амаральна!
**Вера**. Кальмары – апазіцыянеры!
**Каця**. Масліны ды алівы – гэта адстой!
**Вера**. Марцыпаны – папса папсовая.
**Каця**. А кава з дзікунскім назовам глясэ – трэш, смецце!
**Лёша**. Ё! Ё! Ё!
**Вера**. Усе мусы – хамы!
**Каця**. А ласось – пачварства!
**Вера**. Усю ікру да чорта!
**Каця**. Труфелі свінням на іхні бізнэс-ланч!
**Вера**. Усе баклажаны – нягоднікі!
**Лёша**. Да расстрэлу!
**Каця**. Вугор даўно адплыў на поўдзень!
**Вера**. Прычым, ужо вэнджаны!
**Каця**. А з ім і сцерлядзь маньячка!
**Вера**. І ідыётка сёмга!
**Каця**. А якая агідная хурма!
**Лёша**. Увага! Плі!
**Вера**. Усім сушы зрабіць харакіры!
**Лёша**. Банзай.
**Каця**. А крабы – камікадзэ!
**Вера**. А пармезаны, ракфоры, дор блю…
**Каця**. З якімі віна іхняя…
**Вера**. У канцлагер!
**Каця**. У печ!

**Лёша**. Зразумела! Хопіць! І каньяк – пашляк! Ё! Ё! Ё! З мяне досыць! Іду на фронт! У камандзіроўку!
**Вера**. Я буду чакаць цябе, родны, каханы.
**Лёша**. “Жди меня и я вернусь, только очень жди”… *(Выходзіць)*
**Вера**. Я дачакаюся цябе, Лёшачка!!! *(Бяжыць за ім і падае).*
**Каця**. Ой, гора! Ой, бабы, гора!!!
**Вера**. Вяртайся пераможцам, калі зразумееш мяне, Лёша-а-а-а-а!!!
**Каця**. Гора!!!
**Вера**. Лёша-а-а-а!
**Каця**. Якое гора!!!
**Вера**. Лёшачка! Родненькі!!!
**Каця**. О-о-о-о-о-о-ой, гора!!!

*Заслона.*

## ДРУГІ АКТ

*Аднойчы матыльку лімонніцы прысніласся, што ён партызанка: ён ляцеў на першае баявое заданне, быў усхваляваны і не ведаў, што ён – партызанка. А раптоўна прачнуўшыся, нават здзівіўся, што ён лімонніца. І не ведаў ужо: ці то яму снілася, што ён – партызанка, ці то партызанцы сніцца, што яна – матылёк.*

### *Сцэна 10*

*Напаўцьмяна ў кватэры інструктара. Гаспадар у “эсэсаўскай” форме. Відаць, што з тэатральнага падбору.*
**Інструктар**. Ну, як я вам?
**Каця**. Мама!
**Вера**. Вельмі нават цікава. Для аднаго разу сыдзе.
**Інструктар**. Як, толькі для аднаго, блін?

**Вера**. Мы аматаркі. Так, з цікаўнасці вырашылі разок паспрабаваць…
**Каця**. І баста.
**Інструктар**. Але, але. Сілком лагоды не даб'ешся. Шкада, блін, што я магу яшчэ сказаць.
**Каця**. І гэта…
**Вера**. Давайце адразу дамовімся. Мы дзяўчаты пяшчотныя…
**Каця**. Пачаткоўцы.
**Інструктар**. Ага. Першы раз у першы клас.
**Вера**. Вы як-небудзь асцярожна.
**Каця**. Мягчэй.
**Вера**. Хаця пасля можна будзе і паактыўнічаць. Калі цярпіма ўсё, значыць, усё добра. Будзем маўчаць.
**Каця**. Але калі будзе вельмі балюча, тады спыняйцеся.
**Інструктар**. А які пароль?
**Вера**. Не зразумела.
**Інструктар**. Слова, пасля якога я мушу спыніцца.
**Вера**. Гэта… няхай будзе…
**Каця**. Іванавіч!
**Вера**. Так, Іванавіч
**Інструктар**. Іванавіч, блін? Якая пошласць. Ды мне, па вялікім рахунку, усё роўна. Іванавіч дык Іванавіч.
**Вера**. Пачнем…
**Інструктар**. Пачнем!
**Каця**. Мама!
**Інструктар**. Якія будуць пажаданні?
**Вера**. Мы дзве сялянкі, якія ведаюць, дзе хаваюцца габрэйскія дзеці.
**Інструктар**. Так, блін.
**Вера**. А вы жорсткі гестапавец, які мусіць у нас з дапамогай катаванняў выбіць паказанні.
**Інструктар**. Што ж, цікавенька.
**Вера**. І давайце без вашых лірычных адступаў.

**Інструктар**. Не вучы мяне жыць і працаваць, блін.
**Вера**. Што глядзіш на мяне, гаўно? Бі мяне, фашысцкая морда!
**Інструктар**. Ах ты, свалата.
*Інструктар пачынае збіваць гераічных артыстак.*
**Каця**. “Расцветали яблони и груши...”
**Інструктар**. Будзем сазнавацца, быдла сялянскае?!
**Вера**. “Поплыли туманы над рекой...”
**Інструктар**. Кажы, дрэнь, дзе хаваюцца габрэйскія дзеці? Хто іх хавае ў сябе? Адказвай!
**Каця**. Ні за што, фашыст!
**Інструктар**. Гавары!
**Вера**. Вам усім капут! Перамога за намі!
**Каця**. Усіх не пераб’еце!
**Інструктар**. Партызанскія курвы! Пазабіваю вас!
**Каця**. “Выходила на берег Катюша...”
**Вера**. “На высокий берег на крутой”.
*Збіццё артыстак працягваецца даволі доўгі час. Яны мужна церпяць боль. Інструктару ўжо не хапае дыхання і сілаў.*
**Інструктар**. Адказвайце! Каму сказаў, адказвайце! Дзе хаваюцца гэтыя жыды? Вы ж ведаеце! Вы павінны ведаць! Гаварыце, хто іх хавае? Хто? Мабыць, Іванавіч? Так? Іванавіч? Я пытаюся: Іванавіч?
**Каця**. Не!
**Вера**. Не, не!
**Інструктар**. Усё, хопіць, досыць. Я не магу так працаваць...
**Вера**. Што не так?
**Інструктар**. Дзяўчаты, я так не магу. Што я, не беларус, ці што? Я ж... я ж... у дзяцінстве з сябрамі ў вайнушку гуляў... я фашыстаў страляў... а зараз... як я магу... блін... як я магу так сваіх... *(Плача).*
**Вера**. Лузер.

**Каця**. Няўдачнік.
**Інструктар**. Я не магу… не магу… дзядуля мой ваяваў…
**Вера**. Дылетант.
**Каця**. Бездар.
**Інструктар**. І па бацькоўскай лініі ў мяне габрэі, блін…
**Вера**. У такім разе мы не будзем плаціць.
**Каця**. Правільна!
**Інструктар**. І не трэба… я не вазьму вашыя брудныя грошы… Фашысткі!
**Вера**. Чаго?
**Каця**. Што ян**о** сказал**о**?
**Інструктар**. Ідзіце!
**Вера**. Мы фашысткі?
*Вера і Каця збіваюць інструктара.*
**Інструктар**. Што вы мучыце мяне, садысткі? Валіце адсюль! Не трэба! Не трэба! Габрэйскіх дзяцей хавае Іванавіч! Іванаві-і-і-іч!
*Артысткі спыняюцца.*
**Вера**. Во гад.
**Каця**. Здраднік.
**Інструктар**. Даруйце мне, даруйце, калі ласка.
**Каця**. Хадзем.
**Вера**. Чакай секунду. Шкада яго. Добры ж.
*Артысткі падсаджваюцца да інструктара, лашчаць яго, гладзяць па галаве.*
**Вера**. Не плач, не плач, мой… мой Маленькі Прынц. Хочаш? Я намалюю табе сабачку? Дзівоснае шчаня. Гэта будзе твой пекінэсік.
**Інструктар**. Блін, не хачу я пекінэса.
**Вера**. Лабрадорчыка?
**Інструктар**. І лабрадора не хачу.
**Вера**. А якога сабаку ты хочаш?
**Інструктар**. Злога, вялікага, прыгожага.

**Вера**. Я намалюю табе такога сабаку, як ты сам. Галоўнае, каб цябе не выкінулі на вуліцу, як некаторых любімых са свайго жыцця. Лепей эфтаназаваць цябе адразу. Больш не плач. Мы пераможам, блін. Мы абавязкова пераможам!

### *Сцэна 11*

*Цьмянае святло ў кватэры жанчыны – прадавачкі і скупляльшчыцы ювелірных вырабаў. Гаспадыня ў дзіўнаватым і яркім вячэрнім строі. Відавочна, што з сэканд-хэнду.*

**Лёша**. Ой. А хіба прастытуткі бываюць такімі?
**Жанчына**. А што ўва мне не так?
**Лёша**. Нешта... нешта... нешта...
**Жанчына**. У мяне ўсё ёсць, усё на сваім месцы.
**Лёша**. Антураж нейкі не класічны.
**Жанчына**. А ты эстэт?
**Лёша**. Ды ўжо і не ведаю.
**Жанчына**. Ты на гадзіну ці на ўсю ноч?
**Лёша**. Калі спадабаецца, давай на ўсю ноч.
**Жанчына**. Цябе распрануць, малыш?
**Лёша**. Угу... Не, не так.
**Жанчына**. А як ты хочаш? Груба?
**Лёша**. Паспрабуй груба... Ізноў неяк не так.
**Жанчына**. Можа, языком?
**Лёша**. Так. Скажы што-небудзь... ваеннае.
**Жанчына**. Каўбой, дзе твой велічэзны кольт?
**Лёша**. А-ё-ё-ечкі, як вульгарна. Што за тэкст? Што за тэкст?
**Жанчына**. З кіно.
**Лёша**. Якое дрэннае кіно. Трэба што-небудзь суровае, але хвалюючае. Як на вайне. Разумееш?
**Жанчына**. Гэта... Ой, нават не ведаю... Зараз паспрабую. Раз, раз, раз. Увага! У ходзе няспынных і працяглых баёў савецкія войскі вызвалілі гарады Тамбоў...

**Лёша**. Ё! Працягвай.
**Жанчына**. Ліпецк, Варонеж...
**Лёша**. Ё! Ё! Так ужо лепш...
**Жанчына**. А таксама Курск...
**Лёша**. Ё! Распранай мяне.
**Жанчына**. Белгарад, Арол...
**Лёша**. А цяпер пра партызан што-небудзь...
**Жанчына**. Пры адступленні фашысцкія войскі панеслі жывыя страты праз падрыўную дзейнасць партызанскіх атрадаў. Шматлікія загінулі...
**Лёша**. Ну што ты?! Больш пазітыву!
**Жанчына**. Але іхнія імёны назаўсёды застануцца ў памяці народнай...
**Лёша**. Больш пазітыву!
**Жанчына**. Ніхто не забыты, нішто не забыта...
**Лёша**. Ой, не. Не тое. Не ведаю.
**Жанчына**. Расслабся. Ты ўвесь нейкі разумны такі, як на сходзе ў генеральнага дырэктара.
**Лёша**. Так. Я разумею. Ёсць некаторая зацыкленасць. І праблемаў шмат.
**Жанчына**. Мне пра гэта можаш не гаварыць. Жыццё цяпер не цукар. Давай я падсаладжу твой вечар, лейтэнант. Вазьмі мяне!
**Лёша**. Лепей ты мяне вазьмі, як рэйхстаг у сорак пятым. Давай! Ідзі на мяне ў атаку з клічам “ура!”. Паспрабуй.
**Жанчына**. Ура!
**Лёша**. Не! Гучнае “ура!”.
**Жанчына**. Ура! Ура! Ура-а-а-а-а! не атрымліваецца.
**Лёша**. І праўда, самадзейнасць нейкая... Так, давай па-іншаму. Я нібыта ў дзаку ляжу. Ты ведаеш, што такое дзак?
**Жанчына**. Дрэва земляная агнявая кропка.
**Лёша**. Нават я не ведаў.
**Жанчына**. У мяне па ПВП была пяцёрка.

**Лёша**. Вельмі добра. Дык вось я зараз лягу ў дзак, а ты паўзі да мяне з гранатай, каб схапіць у палон і згвалціць. Я гатовы. Паўзі.

**Жанчына**. Нязручна. Ой. Ой.

**Лёша**. Я цябе бачу, зараз застрэлю. Ніцам. Ніцам. Дурная.

**Жанчына**. Ды нязручна мне!

**Лёша**. Не так. Ніжэй! Нахіліся! Нахіліся!

**Жанчына**. Не нахіляецца мне…

**Лёша**. Якая ты ўсё ж такі дурная… Ты мяне не заводзіш.

**Жанчына**. За такія здзекі і абразы з цябе яшчэ дзясятка зверху.

**Лёша**. Не цікава з табою. І ты не профі.

**Жанчына**. Затое я іншае добра раблю. А на калючы дрот са сваёю жонкаю хадзі, а не мяне прымушай, ненармальны.

**Лёша**. Няўмеха.

**Жанчына**. Цябе судзіць трэба за святатацтва над гісторыяй з асаблівай жорсткасцю. Яшчэ і мяне прымушае за грошы блюзнерыць.

**Лёша**. Не прымушаў за грошы.

**Жанычна**. Прымушаў.

**Лёша**. У мяне няма грошай.

**Жанчына**. Што?

**Лёша**. Можна, я табе прадуктамі заплачу?

**Жанчына**. Чаго?

**Лёша**. Прабач. Няма грошай. Але ёсць НЗ. Недакранальны запас.

**Жанчына**. Трындзец.

**Лёша**. Мяне жонка не корміць. Я вельмі есці хацеў. Зайшоў у краму і… вось. Усе грошы патраціў.

**Жанчына**. Мужык, ты сам разумееш, што гаворыш? Мала таго, што я цярпела твае салдацкія сэксуальныя выкрутасы, дык яшчэ…

**Лёша**. Якая розніца? Ты ўсё роўна даляры памяняеш на рублі, а на рублі прадуктаў у краме накупіш.
**Жанчына**. Ды я сама ў краме працую. Мне грошы патрэбны. Заробкі зараз не вельмі-то….
**Лёша**. Ё! Ё! Гэта праўда.
**Жанчына**. Я і так падпрацоўваю, як і чым магу, маці хворая, у шпіталі ляжыць, ёй лекі дарагія патрэбны.
**Лёша**. Так, так. Зараз, куды ні кінься, не фантан.
**Жанчына**. А пакуль яна ў шпіталі, я камандзіровачным пакой здаю і мужчын прымаю.
**Лёша**. Шмат?
**Жанчына**. Ты першы.
**Лёша**. Ё! Ё! Ё!
**Жанчына**. Што там у цябе?
**Лёша**. Кансервы ёсць. Фрукты, сыр. Водкі можам выпіць. Даўно не піў. Хочаш, вячэру разам згатуем? Пасядзім. Проста. Паядзімо. У рэшце рэшт.
**Жанчына**. Што за людзі пайшлі апошнім часам? Веснавое абвастрэнне ва ўсіх, ці што? Так і быць. Адкаркоўвай водку. Здымем стрэс пасля такога… сэксу.
**Лёша**. За знаёмства.
**Жанчына**. І за здароўе, каб абвастрэнне веснавое хутчэй прайшло… О! Файна! Палягчэла.
**Лёша**. Ё! Ё! Ё!
**Жанчына**. А навошта табе гэтыя франтавыя завіхрэнні? Аніякім больш чынам не ўзбуджваешся?
**Лёша**. Жонка давяла. Актрыса. А яно, як бачым, заразна.
**Жанчына**. А мне якія артыстычныя кадры трапляюцца! Ёсць адна жанчына ў горадзе. Кантужаная на ўсю галаву. Сёння раніцаю прынесла мне за “так” дарагія мужчынскія касцюмы, гальштукі, кашулі, туфлі новыя, рамяні. І ўсё ад куцюр. Такія брэнды! Вочы ад прыгажосці такой баляць.
**Лёша**. І што?
**Жанчына**. Кажа, аддай усё ваенным бежанцам. Уяві сабе!

**Лёша**. Ё-ё-ё-ё-ё-ё! Дык іх шмат такіх у горадзе.
**Жанчына**. Шмат. Якім такім ваенным бежанцам?
**Лёша**. Хворая.
**Жанчына**. Я ж кажу, кантужаная. Налівай яшчэ за здароўе. Каб не заразіцца.
**Лёша**. Так, і няхай маці твая хутчэй на папраўку ідзе.
**Жанчына**. Дзякуй.
**Лёша**. А дзе ўсе рэчы?
**Жанчына**. У буцік да знаёмай занесла. Яна мяне так аддзячыла!
**Лёша**. Зразумела!
**Жанчына**. Я хоць прыстойна зарабіла.
**Лёша**. Чаму я гэтую кантужаную не сустрэў? Які ў гэтых трэндаў быў памер?
**Жанчына**. Пяцідзесяты.
**Лёша**. Мой. А абутак?
**Жанчына**. Сорак тры.
**Лёша**. Правільна. Вось так увесь час.
**Жанчына**. А перад гэтым яна мне завушніцы аддала. А першы раз, як і ты, прадукты харчавання хацела за запінкі! Ха-ха-ха!
**Лёша**. Ідыётка!
**Жанчына**. Уяві сабе! Плацінавыя ад Армані!
**Лёша**. Ё! Ё! Ё!
**Жанчына**. Бываюць жа на свеце такія дурніцы малахольныя! Налівай яшчэ!
**Лёша**. Армані? Плацінавыя?
**Жанчына**. Так, так. Армані! Плацінавыя! За звычайны хлеб!
**Лёша**. За хлеб? Ё! Ё! Ё-ё-ё-ё-ё-ё!!! Пятая кропка! Якія ж вакол суцэльныя пятыя кропкі! Паўсюдна пятыя кропкі! Я… Я… Я… Ё-ё-ё-ё-ё-ё.

## *Сцэна 12*

*Позні красавіцкі вечар. Артысткі-партызанкі занятыя прыгатаваннем новай гаручай сумесі.*

**Вера**. Спадзяюся, гэты кактэйль будзе куды больш эфектыўны.

**Каця**. А па мне, дык усё так эфектыўна! Я столькі ў сабе адкрыла, перажыла, ужылася, што губляю пачуццё рэальнасці. Ад мяне апошнім часам такі дзіўны пах. Мабыць, вайною пахну. Сапраўднаю вайной. Хаджу напаўбрудная, напаўсавецкая, напаўпартызанская…

**Вера**. Хопіць ужо пералічваць.

**Каця**. Я так рада, што яна не выбухнула. Але ж ты кінула. Малайцом. Я б не змагла. Я застыла ў глыбокім шоку. Як у кіно. Буйн***ы*** план.

**Вера**. У наступны раз – ты.

**Каця**. Так, я ведаю. Я асуджаная лёсам на подзвіг.

**Вера**. Ой, я цябе прашу. Гэта не так страшна.

**Каця**. Вядома, у нежылы дом нястрашна. А вось у жывога чалавека? У ворага? Як можна забіць жывога ворага? Ты каго-небудзь забівала?

**Вера**. Вядома. Камароў. А яшчэ ў дзяцінстве на вакне лавіла мух і адрывала ім крыльцы…

**Каця**. А я лапкі.

**Вера**. А лапкі навошта?

**Каця**. Каб яны лёталі і не прызямляліся.

**Вера**. Жорстка.

**Каця**. А яшчэ я забіла дзвюх жаб, каб на іх ракаў лавіць.

**Вера**. Я адну ў будатрадзе, каб дождж пайшоў.

**Каця**. Як гэта?

**Вера**. Ёсць прыкмета: заб’еш жабу – пойдзе дождж. А нам так не хацелася працаваць, хацелася спаць, гуляць у карты, з хлопцамі стасункі наладжваць. Я і забіла.

**Каця**. Пайшоў дождж?

**Вера**. Чамусьці пайшоў.

**Каця**. Спрацавала.
**Вера**. Але жабу да гэтага часу шкада.
**Каця**. І мне. Дзвюх.
**Вера**. А я яшчэ вусеняў кідала ў мурашнік.
**Каця**. А я, наадварот, вусеняў у слоіку трымала, лісцё свежае ім прыносіла, каб яны добра харчаваліся і хутчэй зрабіліся матылькамі.
**Вера**. Гадасць.
**Каця**. Ой, усе мы ў дзяцінстве прыдуркамі былі.
**Вера**. Яшчэ і якімі. Верылі ў тое, чаго не бывае.
**Каця**. У каханне?
**Вера**. Гэты ты ў каханне, а я ў камунізм і ў тое, што дзядуля Ленін не пісае і не какае.
**Каця**. Вера!
**Вера**. Што Вера? Даруй мне, дзядуля Ленін, за думкі мае ганебныя. І ты, жабка, даруй мне.
**Каця**. І мне.
**Вера**. Вось. Кактэйль гатовы. Забірай, мая баявая сяброўка, асуджаная лёсам на подзвіг.
*Каця кладзе бутэльку з кактэйлем у сумку.*
**Каця**. Куды пайсці, куды падацца, каго знайсці і з кім узарвацца?
*У пакой залятае Лёша.*
**Лёша**. Вера!!! Вера! Вера? Вера... Што з табою, Вера?
**Вера**. Ты чаго крычыш? Што здарылася?
**Лёша**. Чаму ты ў хустцы?
**Вера**. У нас тыф. Пастрыгліся нагала.
**Лёша**. Не! Не! Толькі не валасы. Не! Толькі не тваe шыкоўныя валасы!
*Лёша зрывае з галавы хустку. Усе валасы на месцы.*
**Лёша**. Ё! Як ты мяне напужала! *(Плача)*
**Каця**. І ён плача.
**Лёша**. Я рэдка. Звычайна мяне натхняюць на слёзы альбо вельмі таленавітыя пісьменнікі, альбо шчырыя артысты.

**Вера**. Лёша, гэта ўсяго толькі алергія. Ты не заўважыў, што канчаецца красавік. Усё цвіце. А ты не выпіў таблетку.
**Лёша**. Так-так. Хутка май.
**Вера**. Ты галодны?
**Лёша**. Дзякуй. Мяне… саюзнікі пачаставалі.
**Вера**. Як усё цудоўна.
**Лёша**. Вера, Вера, Вера… Слухай, Вера, нягледзячы на твой тыф, скажы мне, дзе мае рэчы? Дзе ўсе мае рэчы? Адзенне, абутак, запінкі?
**Вера**. Там, дзе і ўсе мае.
**Лёша**. Дзе?
**Вера**. У эвакуацыі, калі табе ад гэтага палягчэе.
**Лёша**. А дакладна? Ты іх выкінула? Бясплатна раздала?
**Вера**. Калі гэта дакладней, дык – так.
**Лёша**. Вера! Ё! Ё! Ё! Ты кантужаная. Ты разумееш, што цябе кантузіла? У цябе куля ў галаве. Ды што там куля! У цябе там захрасла цэлая аўтаматная чарга.
**Каця**. Гэта груба.
**Лёша**. Там цэлы склад снарадаў.
**Вера**. Я ведаю. Гэта вайна.
**Лёша**. Якая вайна? Якая, у задніцу, вайна?
**Вера**. Не падыходзь да мяне. Тут замініравана.
**Лёша**. Усё! Хопіць! Твая вайна скончылася! Яна даўно была! Даўно. Даўно скончылася!
**Вера**. Не падыходзь!
**Лёша**. З тае пары ўсё змянілася. Ніхто не будзе з намі ваяваць. Нікому мы не патрэбны.
**Вера**. Не падыходзь да мяне – узарвешся.
**Лёша**. Раз-два на год успомнім – і досыць! Няма вайны!
**Каця**. Ёсць.
**Лёша**. Ды пофігу мне.
**Вера**. У маёй памяці ёсць.

**Лёша**. Мяне тады не было. Я тады не жыў. Я зараз хачу жыць. Нармальна.
**Вера**. Не падыходзь, тут міны.
**Лёша**. Мы ведаем пра нейкую там вайну толькі з кіно ды кніжак. Для мяне яна абстрактная. А гэтыя страты зразумелыя. Таму яны страшныя. А вы сволачы. Вы дзве сволачы. Што вы нарабілі? Я жабрак. Я праз вас жабрак. І ты цяпер убогая жабрачка-партызанка! Ты мяне збанкрутавала, спаліла ўсё…
**Вера**. Не ўсё. У цябе ёсць краіна, здароўе, я. Значыць, у цябе ёсць будучыня.
**Лёша**. Якая можа быць будучыня, калі ў нас не будзе ані адзення, ані грошай, ані працы?
**Вера**. Страціць гэта ўсё так страшна?
**Лёша**. Страшна.
**Вера**. Няўжо гэта страшней за вайну? Не падыходзь. Што можа быць больш страшным, чым усё гэта? Адкажы. Мне гэта важна. Вельмі важна. Не падыходзь! Тут міны. Чаго ты баішся на сённяшні дзень больш за ўсё? Чаго? Чаго ты не зможаш перажыць?
**Лёша**. Тваю здраду.
**Вера**. Нечакана. Я гэта запомню. Не падыходзь. Тут міны.
**Лёша**. Ё! Ё! Ё! Няма мінаў! Мінаў няма! Мінаў няма!
**Вера**. Ёсць. Ёсць. Ёсць.
**Лёша**. Яшчэ раз скажаш “ёсць”, і я… пердану. Вось.
**Кацэ**. Ве-э-э-э-э! А яшчэ інтэлегентны чалавек.
**Лёша**. На вайне ўсе роўныя. А інтэлегенцыя, тут прысутная, забылася на сваю інтэлегентнасць. І ўвогуле, Каця, пайшла вон адсель да пана-паліцая.
**Каця**. І пайду. Ты мне… агідны. *(Да Веры)* Твой муж садыст. Яшчэ які садыст. Ой, садзюга! Якая садзюга! Узняў тут лямант праз свайго Гучы. Фашыст. Хатні гаўляйтэр, штурмбан-бан-фурэр, блін… НЕ дэспатыі!
**Лёша**. Давай, партызанка, калдыбай у сваю зямлянку.

**Каця**. Узарваць бы цябе!
**Лёша**. Сама не падарвіся!
**Каця**. Аўфідэрзэйн, майн лібэ! Перадай Гітлеру ад мяне глыбое аральнае прывітанне! *(Выходзіць).*
**Лёша**. Ё! Ё! Ё! Ё! Ё!
**Вера**. Хочаш, я намалюю табе кашулю ад Дзіёра. Якога колеру?
**Лёша**. Ё! Ё! Ё!
**Вера**. Вось табе белая, дзве бэзавыя, твае любімыя, яшчэ блакітная. А вось апошні касцюм ад Дольчэ Габана. Ты такога не меў. Лепей два. Ты любіш у рэстаран цёмна-сіні. Вось гальштукі, глядзі. Вось паласаты, вось размаляваны. А вось клубныя пад тваю бэзавую кашулю. Зараз плашч і парасон-тросць, калі раптам дождж пойдзе. Туфлі. Вядома, італьянскія брэнды. Чорныя. Яшчэ адны. Цяпер карычневыя. Цёмна-шэрыя. Няхай будуць лакавыя. Так па-святочнаму. А вось доўгая люстраная шафа. Яна цалкам забітая рэчамі, толькі тваімі рэчамі, якія сабе хочаш…
**Лёша**. Я сёння ў офісе ўпершыню ў сваім жыцці верш напісаў.
**Вера**. Добры?
**Лёша**. Кепскі.
**Вера**. Пра што?
**Лёша**. Пра ўсіх.
**Вера**. Пачытай.
**Лёша**. Смяяцца не будзеш?
**Вера**. Не смешна.
**Лёша**. Сапраўды, нічога смешнага.
**Вера**. Тады чытай.
**Лёша**. У навінах сказалі:

На фондавай біржы абвалілася любоў,
Зніжаецца курс пяшчоты,
Цыркулюе са зніжкамі кроў,

Народ у паніцы ў банках
Закрывае па ўкладах пачуцці,
На вітрынах целаў, на касах душаў
Кругласуткава пуста.
Мы вылічваем з заробкаў узаемнасць,
Адгрызаем у жарсці караты
І здаем раз на год у падатках сардэчныя страты.
Ё! Ё! Ё!
Вось так і жывем на Айчызьне велічнай
З мужчынскім адчуваннем месячных.

### *Сцэна 13*

*Гэтая ж красавіцкая ноч. Раз'юшаная і асуджаная лёсам на подзвіг Каця хутка ідзе па бульвары, дзе на лаўках "культурна адпачывае" тутэйшая моладзь. Цудам не разбітыя ліхтары асвятляюць толькі Кацін твар.*

**Галасы**. Куды шпарыш, цаца? А? Цаца? Барбі, не віхляй задам так хутка! Прыпыні хаду! Куды разагналася?

**Каця**. На подзвіг.

**Галасы**. Які такі подзвіг? Яшчэ паспееш! Адпачні з намі, чыкса. Выпі за свята – Першамай.

**Каця**. А ты варты гэтага свята?

**Галасы**. Яшчэ як! Вылупі вочы, я ж рабочы! Пацалуй трудяшчыхся!

**Каця**. Больш нічога не жадаеце?

**Галасы**. Можна і больш. А папец у цябе нічогі такі.

**Каця**. Гэты папец у танках гарэў, пакуль ты, гопнік, у пад'ездах гадзіў, лямпачкі выбіваў, на сценах цвіком свой крук выдрапваў.

**Галасы**. О-о-о-о. Загаварыла. Роцік працу ведае. Можа табе цвічком праміж ножак надрапаць? Альбо ножык да горла, каб не вякала?

**Каця**. Ды я вас, гапата, і ноччу не баюся.

**Галасы**. “Ой, як хочацца чорную смелую жэншчыну ў Дзень Пабеды!”.
**Кацця**. Ты дажыві яшчэ да перамогі.

**Галасы**. Апупець! Храбрая ты наша, мы цябе не адпусцім, пакуль не пасядзіш з намі. Бо нам сумна без цябе.

**Кацця**. Ах, сумна вам. Няма чым заняцца? Толькі п’еце, ныеце, смуродзіце, залiваеце сваю нікчэмнасць?

**Галасы**. Гэтая каза пачынае мяне раздражняць. Яна, здаецца, не разумее…

**Кацця**. Гэта вы не разумееце… не жадаеце заўважаць… вашыя дні бездапаможна… бездапаможна і бяздарна сціскаюцца ў спружыну… спружыну… ціснучы на вас беспрасветнай шэрасцю… Няўжо вам не зразумела… не зразумела, што спружына… спружына можа… можа рэзка расціснуцца і выкінуць вас у абсалютную ўбогасць?

**Галасы**. Хрэнь нейкая. Паэзія! Хто-небудзь зразумеў гэтую Крупскую? А хто такая Крупская? Ты што? Жонка Крупскага. А! Ясна. Можа, па кругу яе пусцім?

**Кацця**. Так. Цудоўная думка, жывёліна. Зараз запалім з вамі гэтую ноч! Хто першы?

**Галасы**. Ды яна сэксуальна заклапочаная. Наш чалавек!

**Кацця**. Ваш! Ваш! Толькі перад сэксам выпіць хочацца.

**Галасы**. Калі ласка. Табе водкі? Піва? Можа, чарліка?

**Кацця**. У мяне сваё ёсць. Фантастычны кактэйльчык. Усё сваё нашу з сабою.

**Галасы**. Гаспадарлівая, блін!

**Кацця**. Два глытка для рыўка. І паліць вельмі хочацца.

**Галасы**. Палі бамбук.

**Кацця**. Не грубі. Лепей пачастуй цыгарэткай, у цябе трусы ў клетку.

**Галасы**. Абаржацца! Клёвая бабэлка трапілася!

**Кацця**. А то! Усё лепшае наперадзе! Дзе мая запальнічка? Вось яна. Ну што? Вось і ўсё… Гапата! Вы звяр’ё, гапата! З надыходзячым! Бабах!!!

**Галасы**. Бубух!!!
*Ад выбуху ліхтары ўжо не ўцалелі.*

### *Сцэна 14*

*Вера ў заапарку сядзіць на лаўцы і пазірае на вальеры. Да яе падсаджваецца жанчына-прадавачка, яна ж скупляльшчыца ювелірных вырабаў і прастытутка - няўдачніца.*

**Вера**. А вы ўжо ў заапарку арудуеце?

**Жанчына**. Даводзіцца. Я за маму працую. Яна ў шпіталі ляжыць хворая, вось я і падмяняю яе. А вы з якімі мэтамі?

**Вера**. Таксама працую.

**Жанчына**. Таксама некага замяняеце?

**Вера**. Так, адну партызанку на спецзаданні. Вы бачылі яе са мною ў краме. Яна зараз раненая.

**Жанчына**. Цікава.

**Вера**. Вельмі. Як вы думаеце? Гэтыя жывёлы ў клетцы разумеюць, што яны палонныя?

**Жанчына**. А што? Жывёлам добра. Жывуць сабе, ляжаць сабе...

**Вера**. А можа гэта габрэйскае гета? Ім добра было б там жыць сабе, ляжаць сабе? Раптам гэтаму жораву страшна. Ён думае, дзе ягоныя дзеці. А гэтая ліса? Яе адабралі ад мужа. Ён у адным канцлагеры, яна ў іншым. Гэтая лама з жахам думае: сёння яе спаляць ці заўтра, адбяруць ейны хвост, футра, залатыя зубы. А як памрэ страус? Ад газу ці ад голаду? А ці паспеюць вызваліць зуброў саюзнікі ў апошні момант перад пакараннем смерцю?

**Жанчына**. Брррр. Як тут мама працуе? Брррр. Вы мне настрой сапсавалі.

**Вера**. Можа, дапаможам ім збегчы?

**Жанчына**. Маёй маці гэта не спадабаецца

**Вера**. А вы не баіцеся, што раптам вайна пачнецца?

**Жанчына**. Не. І не пачнецца.

**Вера**. А чаго можна баяцца?
**Жанчына**. Ну… калі раптам знізяць заробкі яшчэ больш, адправяць у адпачынак без аплаты, скароцяць на працы… Ці я не выйду замуж… Ці калі маці мая памрэ… Гэтага баюся.
**Вера**. Зразумела. А для вас Дзень Перамогі што-небудзь азначае?
**Жанчына**. Гэта свята для ўсіх. А асабіста для мяне? Я ж у краме працую. У нас гэта звычайны працоўны дзень, скарочаны на гадзіну. Салют, вядома, добра, але з кожным годам ён мяне ўсё менш і менш цікавіць. Не цешыць так, як у дзяцінстве. Дый ніводнага ветэрана на ім няма. Толькі п’яная моладзь на яго сунецца, пасля яны бойкі ўчыняюць, гадзяць у нас у двары, бутэлькі б’юць. Раніцаю ідзеш на працу, а вакол шкло і аміяк. Вось табе і Дзень Перамогі.
**Вера**. Вера, як можна граць партызанку, калі ты гэтага да канца не адчуваеш? Як можна святкаваць Дзень Перамогі, не перажыўшы гэтага шчасця? Як адчуць усёй скурай, нутром, целам, кожным органам тое, што тады адбылося? Вера, як ты можаш сыграць і перамагчы, калі твой каханы чалавек не адчувае твае праблемы?
**Жанчына**. Вам дрэнна?
**Вера**. Не, усё ў парадку. Думкі ўслых. Не хвалюйцеся, я не вар’ятка. Я актрыса, і ў мяне заўтра прэм’ера. Я граю партызанку.
**Жанчына**. А! Так бы адразу і сказалі. Ну вы і вырабляеце. Ох, гэтыя артысткі – жанчыны. А ці цяжка граць партызанку?
**Вера**. Цяжка.
**Жанчына**. А, акром вашых фантазіяў, як гэта цяжка?
**Вера**. І фізічна таксама цяжка.
**Жанчына**. Не разумею. Я ў краме на нагах цэлы дзень. Хрыбет моцна баліць. Гэта цяжка. Пасля падпрацоўваю.

На нагах ледзь стаю. Гэта цяжка. Маці даглядаю і тут за яе працую. Вось гэта цяжка. А што цяжкога ў тым, што вы граеце партызанку?

**Вера**. Як вам растлумачыць? Як жа вам усё гэта растлумачыць? Ох-хо-хох. Вы пракладкамі карыстаецеся?

**Жанчына**. Вядома.

**Вера**. А без іх змаглі б?

**Жанчына**. Ой, што вы?! Не!

**Вера**. А я магу. Таму што ў саракавых гадах іх не было. Вось і я два месяцы пракладкамі не карыстаюся. Цяжка?

**Жанчына**. Ой, так, гэта вельмі цяжка. Чакайце! А калі... тое самае?

**Вера**. Калі тое самае, значыць, мяне ранілі.

**Жанчына**. Жах!

**Вера**. Ды я пажартавала!

**Жанчына**. Дзякуй Богу! Дзякуй Богу! Але цяпер я дакладна зразумела, што граць партызанку – гэта цяжка.

**Вера**. Вазьмі гэты пярсцёнак.

**Жанчына**. Ён жа заручальны.

**Вера**. І што?

**Жанчына**. Колькі хочаце?

**Вера**. Нікольki. Прадайце яго і на ўсе грошы купіце гэтым жывёлам з гета кашэрную садавіну, гародніну, вітаміны. Няхай яны верацъ, што яны некаму патрэбны і што нібыта перамога і вызваленне ўжо хутка.

**Жанчына**. Яны не дачакаюцца свабоды...

**Вера**. Яны дачакаюцца ад вас хоць нейкага суперажывання і спачування. Зрабіце гэта.

### *Сцэна 15*

*Майскі вечар. Вельмі горача. Мабыць, будзе навальніца.*

**Лёша**. Які цудоўны сёння вечар. Недзе гром грыміць. Нібыта баі ідуць. Віншую. Заўтра ў цябе прэм'ера.

**Вера**. Дзякуй, зая.

**Лёша**. Як настрой?
**Вера**. Гуллівы.
**Лёша**. У сэнсе, ад слова “грацьˮ? Заўтра, у тэатры?
**Вера**. Не толькі. Хочацца і цяпер пайграць.
**Лёша**. Ё! З чаго б гэта?
**Вера**. Ды вось бабуліны гены ўзыгралі.
**Лёша**. Ё! А мат***у***з табе навошта?
**Вера**. У нас, у партызанак, так прынята. Не хвалюйся.
**Лёша**. Не, ты чаго? Я ў такія гульні не гуляю!
**Вера**. А давядзецца. Усё! Я захапіла цябе ў палон.
**Лёша**. Новыя падпольныя гульні?
**Вера**. А чаму б не? Да сцяны! Апусці рукі. Малайцом. На крэсла. Калі ласка, каханы мой. Сядзь на крэсла. Які ты ў мяне пужлівы. Як аленяня Бэмбі.
*Вера звязвае рукі Лёшы і прывязвае яго да крэсла.*
**Лёша**. Далей што?
**Вера**. Вось так добра. А цяпер ты будзеш ваенным вуаерыстам. Гэта твой пункт назірання. Сачы ўважліва, як падпісваюць капітуляцыю твае страхі.
**Лёша**. Вера, што адбываецца?
**Вера**. Ты сам усё ўбачыш.
*Вера адчыняе ўваходныя дзверы і запускае інструктара па фітнесу.*
**Інструктар**. Я своечасова?
**Вера**. Ты заўсёды своечасова. Я так сумавала без твайго грывуазнага голасу з адценнем мяккай вясны…
**Інструктар**. Клас, блін.
**Лёша**. Хто гэта?
**Вера**. Як мне падабаецца, мой маленькі, твая пашлаватая мордачка з вачыма колеру карамелі…
**Інструктар**. Праўда, блін?
**Вера**. Не. Яны колеру крыльцаў майскага жука.
**Лёша**. Хто гэта?

**Вера**. Не трэба звяртаць на яго ўвагі, прыгажун. Ён нам плаціць за сеанс нашага эксгібіцыянізму.
**Лёша**. Што?
**Вера**. Давай! Увайдзі ў мяне, мой кволы конік.
**Інструктар**. Супер!
**Лёша**. Вера, супакойся! Развяжы мяне!
**Вера**. О, так... Вось так... Добра... Цалуй мае грудзі. Які ты спартовы, мача, мускулісты...
**Лёша**. Вера, так нельга. Развяжы мяне! Гэта жорстка, Вера!
**Вера**. Працягвай...
**Лёша**. Гэта забаронены прыём. Так нельга!
**Вера**. Так! Вось так! Хутчэй, хутчэй...
**Лёша**. Ты не такая. Не такая, Вера! Хаця б кроплю спачування...
**Інструктар**. Ён плача.
**Вера**. Не звяртай увагі. У яго алергія. Ён вясною заўсёды плача.
**Інструктар**. Ён сапраўды плача, блін.
**Вера**. Не выпіў таблетку. У яго прыступ.
**Лёша**. Не! Гэта не алергія! Гэта не кветкі! Гэта не вясна!
**Вера**. Ой, як добра!.. А што гэта, у такім разе? Што?
**Лёша**. Гэта... Гэта... апакаліпсіс... Гэта пекла... я ў пекле. Я на вайне...
**Вера**. Табе страшна?
**Лёша**. Хопіць! Хопіць! Спыніцеся! Я не магу на гэта глядзець. Гэта мярзота!
**Вера**. Працягвай. Вось так! Так. Табе страшна?
**Лёша**. Гэта жах! Вайна – гэта смерць. Смерць. Спыніцеся! Я ж жывы чалавек. Жывы. Я ж кахаю цябе. Я не магу гэтага вытрымаць. Не магу! Гэта страшна. Я жывы чалавек! Я жывы... жывы... жывы... чалавек...
*Лёша губляе прытомнасць.*
**Інструктар**. Блін, ён страціў прытомнасць.

**Вера**. Ён цяжка ранены. Трэба перанесці яго ў ложак.

### *Сцэна 16*

*Калідор шпіталя. Каця з перабінтаванымі рукамі няўклюдна есць абаранкі. Да яе падыходзіць жанчына – прадавачка-скупляльшчыца і гэтак далей.*

**Жанчына**. Прывітанне! Я вас пазнала.

**Каця**. А-а-а, так... Вітаю, вітаю.

**Жанчына**. Вы мне даруйце за той... наезд. Я тады яшчэ не ведала, што вы артыстка-партызанка.

**Каця**. Нічога, нічога. Я і сама тады не ведала, што зраблюся добраю артысткай-партызанкаю.

**Жанчына**. Як яно?

**Каця**. Вы пра што?

**Жанчына**. У вас учора нібыта прэм'ера была?

**Каця**. Так. Гэта было цудоўна. Я так грала! Гледачы амаль вылі ў захапленні. Мне пляскалі, пляскалі... Я ніколі так не сыграю.

**Жанчына**. Сыграеце, яшчэ як сыграеце. А з рукамі што?

**Каця**. Абпяклася нядаўна, ліхтары тушыла. І якраз перад прэм'ерай. Але мне гэта дапамагло лепей ужыцца ў ролю. На перавязкі цяпер хаджу.

**Жанчына**. Гэта, мабыць, балюча і непрыгожа для вас?

**Каця**. Затое ў мяне закахаўся доктар. І мне гэта падабаецца. Усе гэтыя дні ён выклікае ў мяне ўсмешку. Я шчаслівая на кожнай перавязцы.

**Жанчына**. Гэта добра. І я шчаслівая. Мама мая ідзе на папраўку. Пасля свята выпішуць.

**Каця**. Так, заўтра Дзень Перамогі.

**Жанчына**. Са святам!

**Каця**. Дзякуй. І вас.

**Жанчына**. Вам зручна абаранкі есці? Можа, дапамагчы?

**Каця**. Не, я ўжо прывыкла. Частуйцеся.

**Жанчына**. Ды неяк... не ведаю. Я ж у краме працую.

**Каця**. Нічога. Яны смачныя.

**Жанчына**. Дзякуй. Я сёння нават не паснедала. Заматалася я на розных працах. Усё нейкая мітусня! А калі заўтра раптам вайна? Куды тады ўвесь мой пасаг? Эх... Ніколі не думала, што абаранкі такія смачныя. Вазьміце за гэта брошку. Яна залатая.

**Каця**. Што вы? Не трэба. Гэта ўсяго толькі абаранак!

**Жанчына**. Дык і гэта ўсяго толькі брошка! Падумаеш, залатая.

**Каця**. Добра.

**Жанчына**. Дазвольце дапамагу.

*Жанчына прышпільвае на грудзі Каці брошку як медаль.*

**Жанчына**. Вам пасуе.

**Каця**. Служу Саве... Ой, не найграеш – не сыграеш.

*У гэты час па прыёмным аддзяленні ідзе інструктар па фітнесу.*

**Каця**. Малады чалавек! Малады чалавек! Вітаю! Вы да каго?

**Інструктар**. Здароў, блін. І вы тут? Жах.

**Каця**. Я жах?

**Інструктар**. Ой, прабачце. Я не пра гэта.

**Каця**. Што вы тут забыліся?

**Інструктар**. Ай. Вось да псіхатэрапеўта запісаўся. Нервы, блін, ні да чорта. Вайна сніцца. Партызанкі розныя...

**Каця**. О! Гэта сур'ёзна. Дарэчы. Вось. Раю. Вельмі добры псіхолаг. Спецыяліст з вялікім пасагам. Ой, я хацела сказаць: з вялікім займальным вопытам.

**Інструктар**. Я ўвогуле...

**Каця**. Уважліва вас выслухае, супакоіць, зацікавіць. Працуе па выкліку.

**Інструктар**. Праўда?

**Каця**. Вядома. Я дрэннага не параіла б. Мне на прыём. Знаёмцеся, разбірайцеся. Пакуль-пакуль. Калі што пойдзе

не так, дык не крыўдуйце. Яшчэ раз са святам. *(Выходзіць).*

**Жанчына**. З днём!

**Інструктар**. Перамогі... Вы ведаеце, я апошнім часам дрэнна сплю. Ці то поўня, ці то 9 мая, але я як партызан. Ваюю ўсю ноч, а пасля ў дзікім жаху прачынаюся ад кожнага шораху, ад аўтасігналізацыі, ад шэпту за вакном...

**Жанчына**. Я вам дапамагу. Я дапамагу вам.

### *Сцэна 17*

*Майская ноч, цёплы ложак.*

**Лёша**. Піць... Піць...

**Вера**. Цярпі, каханы, табе нельга піць.

**Лёша**. Вады... Піць хачу... мне баліць...

**Вера**. Цябе ранілі. Цішэй, цішэй, каханы. Цярпі, Лёша, цярпі.

**Лёша**. Як мне дрэнна... нібыта мяне звязалі...

**Вера**. Цябе раніла ў баях, я вынесла цябе з поля, табе ампутавалі ўсе непатрэбныя пачуцці і думкі, табе цяпер будзе лягчэй...

**Лёша**. Мне здавалася... быў перыяд касмічнага зацьмення... За гэты час я навучыўся любіць боль, перажыў смерць... навучыўся ажыццяўляць дзівосы, выпіў шмат карвалолу... а ў апошнюю ноч зацьмення я танчыў у клубе... на вечарыне ўласнага мазахізму...

**Вера**. Ты трызніш. Гэта нармальна.

**Лёша**. Я замаўляў на бары новыя порцыі болю... каб зразумець, наколькі я магу быць моцным... Я ўсё гэта вытрымаў... Я моцны...

**Вера**. Ты моцны. Ты вельмі моцны.

**Лёша**. І велікадушны. Толькі гэта так цяжка – быць моцным... і як крыўдна быць добрым...

**Вера**. Гэта трызьненні. Усё будзе ў парадку. Мы жывем. Мы будзем жыць.
**Лёша**. Як баліць...
**Вера**. Так здараецца пасля кантузіі. Ачуньвай. Вайна ўжо скончылася.
**Лёша**. Скончылася?
**Вера**. Так. Мы перамаглі.
**Лёша**. Мы ўсё ж-такі перамаглі. Ё. Ё. Ё.
**Вера**. Ё. Ё.
**Лёша**. Ё. Ё. Ё.
**Вера**. Спі, мой харошы. Спі моцна. І храпі. Храпі моцна. Цяпер можна храпець на ўсю моц. Спі, сонейка маё.
*За вакном грыміць салют.*
**Вера**. Цішэй, не бойся. Гэта святочны салют. Гэта Дзень Перамогі. Спі, любы. Я калыханку табе заспяваю. Спі, мой каханы.

Белы бусел ляціць,
Над бялявым Палессем ляціць.
Беларускі матыў
У песне верасаў, у песне ракіт...

**Лёша**. Ё. Ё.
**Вера**. Спі, спі.

Маладосць мая
Беларусь і я
песня партызан, сосны ды туман.
Песня партызан, пунсовая зара.
Маладосць мая
Беларусь і я

*Заслона.*

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год